Забава
«Восеньскі кірмаш»
для дзяцей старэйшага ўзросту

Праграмныя задачы: садзейнічаць стварэнню вясёлага настрою дзяцей падчас свята; папаўняць веды дашкольнікаў пра традыцыі святкавання народнага свята; актыўна праяўляць сябе ў музычна-выканальніцкай і творчай дзейнасці; развіваць добразычлівыя ўзаемаадносіны паміж дарослымі і дзецьмі; выхоўваць цікавасць да народных культурных традыцый.

Матэрыял і абсталяванне: прадметы беларускай мэблі, посуд, кош, беларускія касцюмы, рушнікі, снапочкі каласкоў, 2 карзіны з гароднінай і садавінай, дзіцячыя музычныя інструменты (трашчотка,дудкі, драўляныя лыжкі, ксілафоны, бубны, маракасы, бубянцы), шляпы,прутики, палочки, пачастункі: яблыкі, пірагі.

Папярэдняя работа: знаёмства выхаванцаў з побытам, традыцыямі, народнымі промысламі жыхароў роднага краю; развучванне народных гульняў, танцаў, песень; чытанне літаратурных твораў аб беларускім краі, аб восені.

Дзеючыя асобы: дарослыя - Гаспадыня, Гаспадар Рыгор, Восень, госці – дзеці.

Ход свята:

Гучыць беларуская народная мелодыя и аудыезапіс голасу.
Голас: Увага! Увага! Увага!
Зараз тут чакае вас
Вясёлай забавы час.
Вы не стойце ля дзвярэй,
Заходзьце да нас хутчэй!
Арод збіраецца –
Наш кірмаш пачынаецца!
*Гучыць музыка, уваходзяць некалькі дзяцей.*

1. Мы звычай зямлі сваей зберагаем,
Усіх гасцей шчыра вітаем!
2.Да нас на свята запрашаем
І сардэчна ўсіх вітаем!
3.І дарослых, і дзяцей,
І шаноўных усіх гасцей!
4.Хай песні гучаць і чуецца смех —
Весялосці і радасці хопіць на ўсіх!
5.Усе хутчэй сюды бяжыце,
На кірмаш наш паглядзіце!
6. Сёння запрашае нас

(разам)Беларускі наш кірмаш!

Гучыць музыка “На Кірмаш” В.Волах, дзеці уваходзяць у зал, выконваюць рухі карагода. Пасля карагода садзяцца на месцы.
Вядучы: Сонца яркае ўстае,
На кірмаш народ ідзе!
Надышоў вясёлы час,
Завітаў кірмаш да нас!

А кірмаш, дзетачкі, — гэта свята, якое адбывалася восенню. Але, перш чым яго ладзіць, трэба было добра папрацаваць на зямлі, вырасціць і сабраць ураджай. На гэтым свяце людзі славілі сапраўдных гаспадароў. І мы сабраліся сёння, каб успомніць беларускія народныя традыцыі, навучыцца мудрасці нашых продкаў.
(звяртаецца да бацькоў) Дзякуй, госці дарагія, што не спазніліся,
А грошы ўзяць на кірмаш не забыліся? *Бацькі адказваюць*
Вядучы: Вось і добра! Усе тут, ці не? (адказы)
Не, не ўсе! На наш кірмаш сама Восень ідзе,
Свой багаты ураджай ўсім яна нясе!
Вядучы запрашае дзяцей узяць лісточкі, сустракаць Восень.
Голас: Завітала восень у беларускі край,
Фарбай залатою размалёван гай.
Ярка чырванеюць ягады рабін,
Пажаўцела лісце клёнаў і асін.
*Дзеці з восеньскімі лісцікамі сустракаюць восень и выконваюць рухи пад музычны акампанемет “Танец асенніх лісточкаў” Д.М.Даўгалеў, У.Г.Пецюкевіч*
Восень: Вось і я прышла да вас, добры дзень у гэты час!
Вядучы: Добры дзень, паважаная Восень! Дзякуй, што да нас завітала. мы з радасцю цябе сустракаем,
І песню заспяваем.
Дзеці выконваюць песню з лісцікамі “Маладая восень” А.Чыркуна
Восень хваліць дзяцей за цудоўную песню. Дзеці кладуць лісце пад стулікі.
(2 гандляра ідуць да 1 стала з садавінай і гароднінай)
Восень: Як цудоўна у вас на кірмашы!
Ёсць тут усё, што трэба для душы! Хваліцеся, што тут у вас ёсць?
(падыходзіць да стала з гароднінай)
Дзеці: 1. Каму арэшкі, прыгожыя арэшкі.
Смачныя, на мяду! Давай у шапку накладу!

2. А вось капусты качаны, кілаграм па шесць яны!
Тут пшаніца, кукуруза, і гарбуз з таўшчэнным пузам.
Восень: Дзеткі, падыходзьце, купляйце, што трэба выбірайце.
*Дзеці выбіраюць вязаную садавіна і гародніну, выконваюць рытмічную гульню “Перадай суседу” пад музычнае суправаджэнне.*

Восень: (хваліць дзяцей) Добра з вамі весяліцца, дзякуй вам за свята, але мне трэба і на іншыя кірмашы заглянуць.
Вядучы: Дзякуй табе, Восень залатая, за твае багатыя дары, вон іх колькі на нашым кірмашы!
ВОСЕНЬ: Да пабачэння!
Пад музыку Восень выходзіць з музычнай залы. Да 2 стала ідуць гандляры.
Вядучы (падыходзіць да 2 стала) Зараз паглядзім, чым тут гандлююць.
Дзеці-гандляры: Гэй,нас сюды хутчэй,
падыходзьце весялей,
усім мірам налятайце,
Музычныя інструменты купляйце!
Весела грайце, і нас не забывайце!
*Дзеці падыходзяць да стала, бяруць музычныя інструменты, выконваюць песню “Зайграй жа, дударочку”б.н.м.*
*“Беларусачка” Г.Дрык*
*Да 3 стала з вырабамі з саломы і гліны ідуць дзеці-гандляры.*
Дзеці – гандляры: Паглядзіце хутчэй! Падыходзьце весялей!
Пазнаемлю з цацкаю льняною і саламянаю!
(дзеці называюць вырабы з саломкі, напрыканцы паказваюць бусла)
Сімвал Беларусі – гэта бусел!
Вядучы: Каб тавар прыдбаць – трэба песню заспяваць!
Дзеці выконваюць песню “Бусел” Г.Дрык

Дзеці-гандляры: А каму гліняны посуд?
Усе сюды хутчэй ідзіце
Зараз гліняны тавар паглядзіце!
Выбірай, купляй, бяры!
Хіба ж мы не ганчары!
*(трымае гарлачык)*Купляйце гарлачык ладны, прыгожы ды зграбны,
На цябе пазірае, купіць запрашае! (аддае другому дзіцяці)
Вядучы: каб прадукцыю прыдбаць, трэба, дзеці, пагуляць! (прапануе дзецям пагуляць у гульню)
Дзеці гуляюць у бел.нар.гульню “Гарлачык” пад музычнае суправаджэнне бел.мелодыі
*Чуецца стук у дзверы, гучыць б.н.музыка, у зал уваходзяць госці: Бабка Еўка і Дзед Талаш. Дзед скача на палцы-кані, баба цягне каляску з бульбай. Спяваюць песню.*
Бабка: Спыніся, дзед, спыніся.
На цуды падзівіся! (пайшла аглядаць сталы з таварамі)
Стужачкі ды хустачкі,
Пернікі ды курачкі!
Ёсць цукеркі, шакаладкі,
Абаранкі, піражкі!

Дзед выгружае бульбу.
Дзед: Баба, куды пайшла, дапамагай бульбу выгружаць. І так чуць не спазніліся, а яшчэ і прадаць яе патрэбна. Якая добрая бульбачка!
(да бацькоў) Хай той папляскае ў ладкі, хто любіць з бульбачкі аладкі., бабку, клецi, пірагі.
Бабка: Бульбу ўсе ў нас шануюць, ей заўжды гасцей частуюць.
*Просяць дзяцей і дарослых назваць стравы з бульбы*

Дзіця: Раз-два-тры-чатыры-пяць,
Будзем бульбачку вітаць!
Дзеці выконваюць танец “Бульба Дэнс”

Баба: Дзед, мне ўхват новы патрэбен, (*падыходзіць да стала).*
Дзед: За колькі ўхват прадаецца?
Гандляр: За вяселыя ўсмешкі і гульні даецца.
Баба бярэ ухват: Дзеці, мне здаецца штосьці,
Што паснулі нашы госці!
Вашы ножкі не баляць? Прапаную паскакаць
Бабка запрашае дарослых(матуль) на беларускую народную гульню “Зайчык”.

Гандляр 1: Падыходзьце, дружбакі да гандлевай лаўкі.
Вось лен наш сінявокі.
Гандляр 2: З яго атрымаліся ручнікі, сурвэткі вышываныя,
Капелюшы і торбы ладныя.
*Дзед просіць у гандляра капялюшы, прымярае, запрашае татаў параіць, які лепшы.*
Дзед: Не буду я гадаць, абодва буду браць.
Баба: Навошта два?
Дзед: Каб у вяселую гульню пагуляць і бацькам свой спрыт паказаць
Дзед з бацькамі гуляюць у беларускую народную гульню “Пастухі”
Ганляр 3: Тавар наш разглядайце,
Што цікава – выбірайце.
Торбачкі купляй-бяры
Для бацькоў і дзетвары!
Дзеці і дарослыя (Баба, Дзед) выбіраюць торбачкі і садзяцца на стулікі
“Дэфіле торбаў”
Дзед і Баба: Добра з вамі мы гулялі,
І спявалі, і скакалі.
Але час і гонар знаць,
Трэба ўсім адпачываць.
Не заўседы нам вось тут
Жартаваць, смяяцца

Трэба зараз нам, сябры,
З вамі развітацца
Шчыра вам жадаем
Каб жылі ў дастатку,
Каб у жыцці вашым
Усе было ў парадку!

Вядучы: Надыходзіць сумны час -
Трэба нам развітацца.
Але просім шчыра Вас
Зноў к нам завітацца!

Гучыць беларуская народная музыка, дзеці і бацькі пакідаюць залу.

Літаратура

Адраджэнне нацыянальных традыцый у дзіцячым садзе (з вопыту работы); распрац.: В. Н. Дуброва, А. П. Мілашэвіч, Л. Ф. Саўчанка.- Віцебск, 1994.
Беларускія гульні ў дзіцячым садзе: дапаможнік для выхавальніка / уклад.: З. І. Ермакова, В. М. Шабека. - 2-е выд., дап.- Мінск: Нар. Асвета,1997
Танцавальны MIX 4: муз.-рытм. кампазіцыі для муз. рук. устаноў дашк. навуч. / В. Чамрукова, Т. Кавалева.-Мінск: Зорны верасок, 2011
Усе поры года я вельмі чакаю /Жабно Я. Г.; - Мн.: Выд. Ул. М. Скакун, 1999.
Чыркун А. “Вясёлы карагод”: (Песні для дзяцей дашкольнага ўзросту ад 3 да 7 гадоў) / А.Чыркун. : Выснова, 2017. – 76с.
Майстэрня музыканту : апісанне вопыту педагагічнай дзейнасці / саст.В.В.Слабодчыкава ; ДУА “Мін. вобл. ін-т развіцця адукацыі, 2020. – 44с.